**Святкаванню маючага адбыцца Дня беларускага пісьменства, які 2-3 верасня пройдзе ў Полацку, увага надаецца на самым высокім, дзяржаўным, узроўні. Праект нацыянальнага маштабу будзе рэалізаваны годна і яскрава, у ім прымуць удзел лепшыя творчыя сілы краіны, чакаюцца шматлікія госці з розных куткоў Беларусі, блізкага і далёкага замежжа.**



# СВЯТА КНІГІ
## і дзяржаўнасці

Пра гэта ішла гутарка на пасяджэнні Нацыянальнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні рэспубліканскага свята, якое адбылося ў мінулы аўторак у Полацку пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Васіля Жарко. У рабоце пасяджэння прынялі ўдзел міністры культуры і інфармацыі Барыс Святлоў і Лілія Ананіч, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пенін, кіруючыя асобы рэспубліканскіх ведамстваў, Віцебскага аблвыканкама і Полацкага райвыканкама.

### ТЭРЫТОРЫЯ ПАДЗЕЙ

Працаваць удзельнікі аргкамітэта пачалі на плошчы Свабоды, адкуль разам са старшынёй Полацкага райвыканкама Мікалаем Шаўчуком і іншымі адказнымі асобамі накіраваліся на агляд месцаў, дзе будуць размяшчацца галоўныя пляцоўкі свята. Мастацкая галерэя, комплекс будынкаў былога езуіцкага калегіума, Сафійскі сабор, Музей беларускага кнігадрукавання — тут разгорнуцца асноўныя падзеі, прысвечаныя ўслаўленню друкаванага слова. Але і зараз гэтыя аб'екты ўяўляюць вялікую цікавасць для кожнага, хто прыязджае ў старажытны Полацк. Так, Васіль Жарко, які ўпершыню наведаў знакавыя месцы першай беларускай сталіцы, не хаваў захаплення ад убачанага.

А калі намеснік прэм'ер-міністра пачуў адказ на пытанне, зададзенае Мудраму старцу, які сустракае наведвальнікаў у аўдыторыі гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ, аб тым, як пройдзе свята ў Полацку: *«На самым высокім узроўні!»* — не здолеў стрымаць эмоцый.

### У ДЭТАЛЯХ

Пасля знаёмства з тэрыторыяй будучага свята аргкамітэт прадоўжыў работу ў канферэнц-зале Музея беларускага кнігадрукавання. Тут у дэталях быў разгледжаны ход падрыхтоўкі да святкавання.

Пасяджэнне адкрыў Васіль Жарко, падкрэсліўшы, што Полацку выпаў гонар у трэці раз прымаць Дзень беларускага пісьменства. І гэта не выпадкова — сёлета сусветная грамадскасць адзначае 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, пачатак якому паклаў палачанін Францыск Скарына, а старажытны горад святкуе сваё 1155-годдзе. *«Гэтыя знамянальныя даты стануць лейтматывам святочных мерапрыемстваў. Цікавасць да іх з боку грамадскасці велізарная, таму падрыхтоўцы надаецца такая значная ўвага»,* — зазначыў ён.

Міністр інфармацыі Лілія Ананіч, пачынаючы выступленне, паведаміла, што запланаваныя падрыхтоўчыя мерапрыемствы і дадзеныя даручэнні выконваюцца згодна з графікам. *«Старажытны Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці, найбуйнейшы культурны і гістарычны цэнтр, тут нарадзіліся святая Еўфрасіння Полацкая, філосаф і паэт Сімяон Полацкі і асветнік і першадрукар Францыск Скарына, тут — Геаграфічны цэнтр Еўропы. Полацк — сімвал беларускай духоўнасці, дзяржаўнасці, незалежнасці»,* — зазначыла яна, падкрэсліўшы, што гэта надае святу асаблівую значнасць. Адметнай падзеяй свята стане адкрыццё памятнага знака «Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці».

Лілія Станіславаўна паведаміла, што галоўная ідэя, лейтматыў урачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства — Беларусь. Міралюбівая, дружалюбная краіна, адкрытая ўсяму свету, якая знаходзіцца на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў і імкнецца ва ўсе часы захаваць лепшае, што стваралі стагоддзямі нашы продкі. Беларусь павінна быць прыкладам, узорам для іншых краін. Беларускі шлях — гэта шлях да ўзаемапавагі, узаемаразумення, шлях згоды, сацыяльнай справядлівасці, духоўнага развіцця чалавецтва. Гэтыя думкі — асноўная ідэя святочнага дзейства. На галоўную сцэну выйдуць знакамітыя беларускія акцёры і музыканты. Адкрыць свята плануецца 2 верасня ўвечары, а 20 гадзіне.

### ДАРОГА ДА СВЯТА

Але свята пачнецца задоўга да афіцыйнага адкрыцця. 30 жніўня са Свята-Духава кафедральнага сабора рушыць у дарогу навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў» з благадатным агнём ад Гроба Гасподня, 3 верасня яна прыйдзе ў Полацк. У яе складзе пройдуць навукоўцы, дзеячы культуры, пісьменнікі, журналісты, прадстаўнікі грамадскасці. Гэтая экспедыцыя будзе асвятляць шлях да Дня беларускага пісьменства святлом духоўнасці і імкнення да ведаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

# СВЯТА КНІГІ
## *і дзяржаўнасці*

1 верасня адбудзецца стаўшы ко добрай традыцыяй III Нацыяльны дзіцяча-юнацкі маладзёжны форум «Скарынаўскія ні ў Полацку». А 2 верасня буе прысвечана святкаванню 155-годдзя горада, падчас якога аксама адбудзецца шмат яскраых падзей. Пройдзе і знакавае мерапрыемства Дня беларускаа пісьменства — Міжнародны руглы стол беларускіх і замежых літаратараў, прысвечаны 00-годдзю беларускага кнігарукавання «Дыпламатыя слова. Францыск Скарына — у сусветай гуманітарнай прасторы». У м плануецца ўдзел літаратараў з 5 краін. Таксама адметная з'ява этага дня — фінал Рэспубліканкага творчага конкурсу юных ытальнікаў «Жывая класіка», таксама прысвечанага 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У эты ж дзень будуць працаваць шматлікія пляцоўкі і праходзіць культурныя мерапрыемствы. Дамінантай вечара стане ўрачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства. Падчас яскравага, маштабнага, запамінальнага сцэнічнага дзейства выступяць зоркі беларускай эстрады і лепшыя творчыя калектывы краіны і Віцебшчыны. А кульмінацыяй велічнай дзеі стануць лазернае шоу і феерверк.

*«Полацк, напэўна, самы багаты з гарадоў, якія прымалі Дзень беларускага пісьменства, на жаданне ўкласці ў свята самыя лепшыя творчыя набыткі, якіх у яго шмат»,* — зазначыла Лілія Ананіч. Яна таксама паведаміла, што Міністэрства інфармацыі плануе выпусціць кнігу-альбом «Полацк», зборнік твораў полацкіх паэтаў і празаікаў «Полаччына літаратурная», фотаальбом, прысвечаны Полацку.

Яскравым і запамінальным у шэрагу святочных падзей стане фэст сярэднявечнай культуры «Рубон». А моцны творчы патэнцыял Маладзёжнай сталіцы Беларусі прадставіць свята-фэст «Мы ў тэме. Перазагрузка».

Падзеі свята атрымаюць шырокі рэзананс — іх будуць асвятляць больш за 100 журналістаў не толькі з Беларусі, але і з блізкага і далёкага замежжа.



Працяг свята — 3 верасня, і зноў — важныя і цікавыя мерапрыемствы. Адбудуцца ўручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі і літаратурна-музычная праграма. Таксама пройдзе ўрачыстая перадача эстафеты свята сталіцы Дня беларускага пісьменства 2018 года гораду Іванава (Брэсцкая вобласць) і закрыццё Дня беларускага пісьменства.

### ПА ЎСІХ НАКІРУНКАХ

Прымаючы ўдзел у рабоце аргкамітэта, старшыня Полацкага райвыканкама Мікалай Шаўчук зазначыў: *«Мы разумеем значнасць маючай адбыцца падзеі і ўсю адказнасць за яе правядзенне. Яшчэ ў маі 2016 года быў створаны раённы аргкамітэт па правядзенні святочных мерапрыемстваў. Штотыднёва праводзяцца пасяджэнні і штабы. Робім усё, каб Полацк пераўтварыўся ў адну яскравую інтэрактыўную пляцоўку, дзе жыхары і госці свята змогуць дакрануцца да вялікай спадчыны нашай краіны, упэўніцца, што Полацк і Беларусь шмат значаць для свету, што справу Францыска Скарыны годна працягваюць яго нашчадкі».*

Мікалай Мікалаевіч падкрэсліў, што правядзенне Дня беларускага пісьменства ў Полацку будзе садзейнічаць развіццю інфраструктуры горада, а таксама — спрыяць развіццю турызму. Ён выказаў упэўненасць, што Полацк апраўдае высокі давер, і свята, якое прыме наш горад, пройдзе на высокім арганізацыйным узроўні.

У абмеркаванні ўзяў слова таксама намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пенін, які сказаў, што абласное кіраўніцтва аказвае ўсебаковую падтрымку ў падрыхтоўцы, і запэўніў прысутных, што ўсё павінна атрымацца і прайсці на найвышэйшым узроўні.

Аб тым, што робіцца і ўжо зроблена ў Полацку да значных падзей, прысутным распавялі адказныя асобы. Першы намеснік старшыні райвыканкама Сяргей Лейчанка паведаміў аб падрыхтоўцы Полацка і Полацкага раёна да правядзення святочных мерапрыемстваў — рамонтных работах і добраўпарадкаванні аб'ектаў. Пра аб'ёмы і крыніцы фінансавання распавяла начальнік фінансавага аддзела райвыканкама Марыя Карасёва. Аб тым, якія мерапрыемствы рыхтуе Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, расказала яго дырэктар Тамара Джумантаева. З чаго будзе складацца культурная праграма, якую прапануюць установы культуры Полаччыны, праінфармавалі намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Алена Астапава і дырэктар Раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур Вольга Шаркевіч. А намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Наталля Ганебная дадала, што таксама адбудзецца фестываль кнігі і прэсы з прэзентацыямі лепшых выданняў і аўтограф-сесіямі пісьменнікаў. Сваю пляцоўку на фестывалі будзе прэзентаваць і сёлетні 100-гадовы юбіляр, наша газета «Полацкі веснік».

### ПАДВОДЗЯЧЫ ВЫНІКІ

*«Падчас свята мы адзначым 500-годдзе беларускага кнігадрукавання і 1155-годдзе Полацка. Гэта выдатная нагода, каб надаць вялікую ўвагу тэматыцы беларускай дзяржаўнасці. Дзень беларускага пісьменства — знакавая падзея. Полацк прымае яго ў трэці раз, і гэта невыпадкова — ён заслугоўвае асаблівай увагі, але гэта значыць і тое, што ў арганізацыйным плане горад павінен падняцца на новы, больш высокі ўзровень. Упэўнены, што ўсе запланаваныя мерапрыемствы будуць праведзены годна і прыгожа»,* — падвёў вынік пасяджэння Васіль Жарко.

**Алена КАЛЕНІК.**
**Фота Андрэя МАРЦЫНКЕВІЧА.**